# НА БУКРЫНСКІМ ПЛАЦДАРМЕ

**ЗІНЬКОВІЧ МІТРАФАН ІВАНАВІЧ нарадзіўся ў 1900 годзе ў вёсцы Пячары Касцюковіцкага раёна. Васемнаццацігадовым юнаком уступіў у рады чмрвонагвардзейцаў, у баях адстойваў існаванне першай у свеце рабоча-сялянскай дзяржавы.**

**З таго часу ўсе яго жыццё пераплялося з лёсам Савецкай Арміі. Ад радавога чырвонаармейца вырас да генерала, камандзіра 12-га гвардзейскага танкавага корпуса.**

**Званне Героя Савецкага Саюза генерал-маёру М. І Зіньковічу прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 17 лістапада 1943 года (пасмяротна).**

Канец лета і восень 1942 года. Ішлі жорсткія баі ля сцен Сталінграда. Фашысты прадпрымалі атаку за атакай, імкнучыся ўзяць Варонеж. Грымелі гарматы ля Калугі і Ленінграда.

У гэты цяжкі для краіны час генерал-маёр Мітрафан Іванавіч Зінькевіч прымае камандаванне 12-м танкавым корпусам 3-й танкавай арміі Варонежскага фронту. А хутка ў раёне станіцы Канціміраўка пачынаецца бой, які прыносіць перамогу савецкім танкістам. Прарваўшы варожую абарону, корпус Зіньковіча накіроўваецца на поўнач, насустрач наступаючым адтуль сваім войскам. Нішто не магло стрымаць імклівы марш танкістаў, і ўжо на чацвёрты дзень пасля прарыву – 18 студзеня 1943 года – кальцо замыкаецца. У катле паблізу горада Россаш аказаліся заціснутымі ў звіліне Дона восем варожых дывізій.

Амаль дзесяць дзён не змаўкалі баі па ліквідацыі акружаных варожых войск. Маючы багаты вопыт вайны ў суровых зімовых умовах, генерал Зіньковіч умела кіраваў сваімі часцямі, наносячы па ворагу ўдар за ўдарам. 27 студзеня варожыя дывізіі былі поўнасцю ліквідаваны.

У першыя дні лютага 12-ы танкавы корпус з горада Валуйкі рушыў у напрамку Харкава і хутка авалодаў станцыяй Малінаўка, а яшчэ праз дзень – 10 лютага – вызваліў ад фашыстаў горад Чугуеў. Развіваючы далейшае наступленне, Зіньковіч павёў свой корпус у абход Харкава з поўдня. Быў вызвален буйны чыгуначны вузел Мярэфа, і гэта ў многім садзейнічала вызваленню Харкава.

Каб не дапусціць далейшага прасоўвання савецкіх войск на Украіне, стрымаць іх націск, а потым перайсці ў контрнаступленне, Гітлер у сярэдзіне лютага сабраў тэрміновую нараду свайго генералітэта, якая праходзіла ў Запарожжы.

– Змыць з нямецкага мундзіра пляму сталінградскага паражэння!.. – распінаўся фюрэр. – Разбіць рускія войскі пад Харкавам!... На нішто

звесці вынікі іх зімовага наступлення!... Уперад!.. Уперад!.. З намі бог!.. – у істэрычным парыве выкідваў ён перад сабой руку, яўна блытаючы дзе ўсход, дзе захад.

У тэрміновым парадку была скалочана група армій "Поўдзень", у састаў якой увайшлі 30 адборных дывізій, у тым ліку 13 танкавых і механізаваных. Агульнае камандаванне імі было даручана фельдмаршалу Манштэйну, які паспеў улізнуць з "катла" пад Сталінградам.

Нямецкае наступленне пачалося з прыходам вясны. Не дабіўшыся поспеху ў лабавой атацы на Харкаў, танкавыя дывізіі "Адольф Гітлер", "Мёртвая галава" і "Райх" абышлі горад з поўначы і 14 сакавіка захапілі Чугуеў. Войскі 3-й танкавай арміі, у тым ліку і 12-ы корпус Зіньковіча, апынуліся ў акружэнні. Яны атрымалі загад на прарыў. Разарваўшы варожыя клешчы, танкісты вырваліся з кальца і 16 сакавіка злучыліся з галоўнымі войскамі Варонежскага фронту.

...Стаялі гарачыя дні лета 1943 года. Ад выбухаў снарадаў, ад скрыгатання танкавых гусеніц, ад бясконцых налётаў авіяцыі стагнала зямля Куршчыны. Карычневая чума зноў паўзла на "тыграх" і "пантэрах" да сцен старажытнага Курска.

Але ўсе спробы немцаў прарвацца да горада былі ліквідаваны. Мала таго, тут, пад Курскам, фашысцкая ваенная машына пацярпела той ракавы крах. пасля якога яна ўжо не змагла аправіцца. Гітлераўскія полчышчы пад напорам Савецкай Арміі пакаціліся на захад.

У летніх наступальных аперацыях 1943 года зноў вылучыліся танкісты генерала Зіньковіча. Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага за адвагу і мужнасць, праяўленыя ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, высокую дысцыпліну і арганізаванасць іх воінскае падраздзяленне было ператорана ў 6-ы гвардзейскі танкавы корпус.

У цесным узаемадзеянні з іншымі часцямі савецкіх войск танкісты-гвардзейцы пядзь за пядзяй вызвалялі родную зямлю. У баях яны знішчылі 84 танкі і самаходныя гарматы праціўніка, каля 120 гармат і мінамётаў, больш як 6000 варожых салдат і афіцэраў. Вызвалены Сумы, Ромны, Прылукі, Ягоцін, сотні вёсак левабярэжнай Украіны. Недзе ўперадзе шырокі Дняпро. Туды, пад прыкрыццё Дняпра, сцягваюць свае патрапаныя полчышчы нямецкія генералы. Там вядуць работы па ўзвядзенню непрыступнага "Усходняга вала".

22 верасня гвардзейцы генерала Зіньковіча выходзяць да Дняпра на поўдзень ад Пераяслаў-Хмяльніцкага і пачынаюць падрыхтоўку да фарсіравання ракі. Бярвенні і дошкі, пантоны і лодкі, пустыя бочкі ад гаручага – усё было пушчана ў ход. Пад прыкрыццём густога асенняга туману пачалася гэта аперацыя.

Першымі на бераг, заняты праціўнікам, высадзіліся і завязалі бой воіны мотастралковага батальёна адной з брыгад. Нягледзячы на жорсткае супраціўленне немцаў, ім удалося замацавацца на

правабярэжжы і стварыць умовы для пераправы падраздзяленням другога эшалона. Да вечара савецкія войскі выбілі фашыстаў з невялічкай вёскі Грыгораўка. Плацдарм расшыраўся.

Гэта быў вядомы Букрынскі "пятачок", які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Адсюль стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання намячала ажыццяўленне апошняй буйной аперацыі 1943 года – вызваленне Кіева. Важнасць расшырэння Букрынскага плацдарма разумеў не толькі генерал Зіньковіч, але і кожны салдат яго корпуса.

Разумелі гэта і нямецкія генералы. І таму, каб ліквідаваць небяспеку, якая навісла над правым крылом армій, што стаялі ля Кіева, яны кінулі на Букрынскі плацдарм свае ўдарныя мотастралковыя і танкавыя часці. Дзень і ноч у невялікай звіліне Дняпра не змаўкалі баі. Прыкрываемые з паветра бамбардзіроўшчыкамі і штурмавікамі, ішлі ў атаку фашысцкія танкі, хвалямі навальвалася пяхота.

Праяўляючы выключную мужнасць, генерал Зіньковіч асабіста кіраваў абаронай плацдарма, сваёй адвагай натхняў воінаў. Фашысцкія атакі наплывалі адна за адной, але стойка абараняліся танкісты. А за іх спіной сапёры ўжо наладжвалі пераправу, прычальвалі пантон да пантона, наводзілі мост, па якім павінны былі пераправіцца на дапамогу храбрацам грозныя "трыццацьчацвёркі" 6-га танкавага корпуса.

24 верасня фашысты прадпрынялі яшчэ адзін масіраваны ўдар па плацдарму і пераправе. Усё патанула ў разрывах бомб і снарадаў, у скрыгатанні гусеніц.

– Гвардзейцы, ні кроку назад! – пачулі байцы знаёмы голас свайго генерала – Смерць або перамога! Нам нельга адступаць...

Шалёны асколак нямецкай бомбы прасвістаў над акопам і ўдарыў у скроню. Цела Мітрафана Іванавіча павольна спаўзло з бруствера, асыпаючы камячкі мокрага ўкраінскага чарназёму.

Гэта быў апошні бой генерала Зіньковіча. Адсюль з берагоў Дняпра, праз дзесяткі іншых пераправаў гвардзейскі сцяг корпуса да Дня Перамогі панеслі іншыя.

**На Букрынскім плацдарме // Магілёўская праўда. — 1970. — 13 лютага. — С. 4.**